№ 34 Ausgabe B.

ГОМАН

Цэна с перэсылкай і дастаукай да хаты: на 1 год—4 м. 80 фэн., на ½ году—2 м. 40 ф., на 3 месяцы—1 м. 20 ф., на 1 мес.—40 фэн.

Беларуская Віленская часопісь
выходзіць два разы у тыдзень: у аўторкі і пятніцы.

Адрэс рэдакції: Вільня, Віленская 33.
Адрэс адміністрацыі і экспэдыцыі: М. Стэфанская 23.

Цэна абвестак: на 4-ай старане за радок дробнымі літэрамі — 25 фэніг.; дробные абвесткі — па 5 фэн за слова. Абвесткі аб сьмерці — 60 фэн. за лінейку дробн. друкам

№ 34 (230). Год III. Вільня, 26 красавіка 1918 г. Цэна 5 фэн. (3 кап.)

25 красавіка.

Заходні тэатр:

На полі бітвы на Ліс адбіта сільная француская контратака проці вяршын Флегэльгук с цяжкімі стратамі. На паўночным заходзі ад Бэтю, пры Фэстібэр і наабапал Скарп — мейсцовые бітвы. На поўдні ад Соммы мы атакавалі англічан і французаў пры Віле-Брэтонэ. У крывавых бітвах наша пяхота с падмогай панцырных самаходаў прабіла сабе дарогу паміж «гнёздамі» кулемётаў. Мы ўзялі Гангар, за каторы ўжо раней ішлі вострые бітвы. На заходнім беразі Авр мы пасунулі нашы лініі да вяршын пры Кастэль. Увесь дзень ворагі пры помачы сьвежых войск вялі вострые контратакі, каторые зламаліся с крывавымі стратамі. Вострые бітвы трывалі ўсю ноч. Узяты больш за 2.000 палонных, 4 гарматы і шмат кулемётаў.

ШТОКГОЛЬМ. Немцы занялі Гэвінгэ і Свэаборг. Чырвоная гвардзія акружэна між Лоё і Рігімэкі. Граніца між Фінляндзіей і Расеей занята. Чырвоная гвардзія рабуе ваколіцы, якіе прымушэна пакідаць, і робіць поўнае зьнішчэньне. Генэрал Маннэргэйм дзякаваў тэлеграмай Гіндэндургу і Людэндэндорфу за вызваленьне Гэльсінгфорсу нямецкім войскам.

БЭРЛІН. Нямецкі ўрад у апошніе дні падаў голандзкаму ураду свае дамаганьні аб плаваньні па Рэйне, дастаўцы вагонаў, спадзеванай умове Голяндзіі с саюзьнікамі аб караблёх і вывазе з Голяндзіі спаўжыўных прадуктаў. Нямеччына с прычыны вялікіх голандзкіх уступак Амэрыцэ і Англіі цьвёрда дамагаецца зраўнаваньня з імі сваіх правоў. Нямеччына ў кожным здарэньні спадзяецца, што Голандзія прыстане на нямецкіе дамаганьні.

ВАШЫНГТОН (Рэўтэр) 24.IV. Гватэмаля заявіла, што лічыць сябе ў палажэньні вайны з Нямеччынай і яе саюзьнікамі.

ЗЭЭБРІНГЭ (В.Т.Б.) 23.IV. Імператар прыехаў сюды пазнаёміцца с падробнасьцямі англіцкай напасьці. Імператар агледаў узарваны жалезнадарожны мост на піры, дзеля адбудовы каторага ўжо ўчыневы крокі. Пасьля ён паехаў да шлюзаў на канале і да ўходу ў канал, дзе затоплены два нагружэнные цэмэнтам англіцкіе крэйсэры. Узяты ў палон у бітве на піры англіцкі марскі капітан сказаў імператару, што опэрація гэная прыгатаўлялася доўга і старанна. Напасьць адкладывалі чатыры разы с прычыны пільнасьці нямецкіх варт. Толькі ў густым тумане опэрація магла быць урэшці праведзена,—на жаль, без спадзеваных рэзультатаў. Вырва ў піры ад узрыву мае ўдоўжкі 25 мэтраў. Напоўненые цэмэнтам тры малые крэйсэры, каторые затанулі ля ўсходу ў канал, праўда, звузілі фарватэр, але і цяпер яшчэ ўход у канал і выхад адкрыт нават для найвялікшых падводных лодак. Дый дзеля ачысткі каналу ад трох затопленых крэйсэраў ужо загаданы адпаведные крокі. Цяжкіе англіцкіе крывавые страты і ахвяра трох крэйсэраў аказаліся гэтак дарэмнымі. Пры гэтак сама неўдачнай опэрацыі проці Остэндэ пагіблі яшчэ 2 крэйсэры.

БЭРЛІН. Рыжскі саюз фабрыкантаў і гільдія сьв. Мары паслалі імператару тэлеграму, дзякуючы за мір з Расеей і здабыцьце волі для Балтыцкіх зямель і высказываючы надзею, што непадзельные Балтыцкіе землі пад дзяржавай нямецкага імператара і ў еднасьці з Нямеччынай будуць мець шчасную будучыну.

У адказ на гэта імператар у сваей тэлеграме кажэ між іншым: «Цьвёрда веру, што с крывавай сяўбы гэтых гадоў нацярпеўшаяся бяды земля крыжацкага закону здабудзе баспечную і шчасьлівую будучыну».

ТОКІО (Рэўтэр). Міністэр заграцічных спраў Мотоно вышаў у адстаўку. Яго месца заняў міністэр ўнутрэных спраў, Гото.

БЭРЛІН (В.Т.Б.). На заседаньні Рэйхстагу памяць пагібшага «Караля лятуноў» ф. Ріхтгофэна дэпутаты ўшанавалі уставаньнем. Паводлуг новых вестах, ф. Ріхтгофэн пахаронен у Ам'ен.

БЭРЛІН. **Урадова.** За месяц марэц затоплено падводнымі лодкамі 689.000 тонн. Гэтак ад пачатку падводнай вайны ўсяго затоплено 16.469.000 тонн.

БЭРЛІН. **Урадова.** Нашы падводные лодкі у поясе блокады каля Азорскіх і Канарскіх астравоў затапілі 11 параходаў, 4 парусьніка і 2 рыбаловы разам 20.622 тонн.

БЭРЛІН. **Урадова.** Новые ўдачы падводных лодак ў поясе блокады навакол Англіі: 22.000 тонн.

Незалежная Беларусь.

Ядыны нацыянальны фронт.

Менскіе беларусы зрабілі у сваей організацыйнай рабоцці вельмі важны крок, каторы найлепей сьведчыць, што тамака палітычная мысль развіваецца правільна і зусім дасьпела дзеля творчай гасударственай працы. Крок гэты — утварэньне „ядынага нацыянальнага фронту“.

„Беларускі Шлях“ у № 20 с 16.IV. 1918 пішэ:

„У Раду Беларускай Народнай Рэспублікі кооптована група беларускіх дзеячаў, стаячая на плятформе Беларускага Прэдстаўніцтва. У гэтай групе ёсць соцыялісты эўропэйскага фасону і ёсць прэдстаўнікі беларускай дэмакратычнай інтэлігенціі, духавенства праваслаўнага і каталіцкага.

„У Раду Рэспублікі адразу вайшоў моцны «цэнтр», і цяпер праца над адбудаваньнем Беларускай Народнай Рэспублікі (Bauerstaat) пойдзе моцнымі крокамі.

„Наскольні Рада пры яе чыста зацыялістычным складзе мела многа крытыкаў дабрахотных і злых, настолькі цяпер—пры новым складзе з беларускім моцным цэнтрам і левым крылом—маець можнасць быць працаздольнай. Правае крыло—з беларускага нацыянальнага пагляду—будуць састаўляць нацыональные меншасьці і цэнтралістычные партыі.

„Патрэбен некаторы час, каб фізіагномія Рады прыняла ясную форму. Цэнтр і левае крыло ўзаемна прытасуюцца: у нацыанальнай палітыцэ у іх будзе мала рожніцы, у соцыяльных справах больш, ці менш далёкай будучыны захаваецца рожніца пунктаў пагляду.

„Мы дачэкаліся вялікай хвілі, калі беларусы зрабілі **ядыны нацыональны фронт.**

„У беларускім палітычным сьвеце гэта вялікае сьвята. Многа памаглі скарэйшаму стварэньню гэтай еднасьці прэдстаўнікі Віленскай Беларускай Рады. Менск там лічаць цэнтрам беларускай дзержаўнай палітыкі.

„Пастаўлена толькі літэра *а* у пачынаючайся рабоце.

„Цяжкі абавязак лёг цапер на Раду Рэспублікі: трэба сьцягнуць Беларусь с тых карчоў, на каторыя сеў яе дзержаўны карабель; гэты карабель апрыч таго ішчэ без мачтаў, парусу і руля. На Менск цяпер глядзіць уся Беларусь, пабітая воляю празначэнэня і больш за яе спрытнымі суседзямі на загародкі, і лініі акопаў, і Дняпро, і Прыпяць. Перэглядываюцца паміж сабой беларусы з задзіўленьнем і цьвёрда верацъ, што гэта скора скончыцца.

„Сэрцамі і нацыанальным пачуцьцём—мы адна нацыя, і такой астанемся. На Менск лёг абавязак мудрай нацыанальнай і міжнароднай палітыкай злучыць усю Беларусь у адну беларускую дзержаву.

„Дзеля гэтага мусіць быць зроблена мобілізацыя ўсіх сіл нашых, стройная арганізацыя іх, зьбіраньне ўсей Беларускай зямлі. На гэта трэба многа халоднага гаспадарскага розуму і гарачага беларускага сэрца. Словы не так будуць патрэбны, як арганічная праца, безабмылковая тактыка і палітычная вытрымаласць“.

Мы шчыра жычым, каб нашым братом, якіе там—у Менску—кладуць фундамэнты пад нашу дзержаўную будоўлю, ўдалося на практыцы дайсьці тэй ідэальнай еднасьці ўсіх творчых беларускіх сіл, якая служыць парукай удачы ўсяе нашае палітычнае работы.

+ Рада Б. Н. Р. назначыла скліканьне установчага сойму Беларусі на 1 сьнежня 1918 г. Падгатоўка выбараў даручэна камісіі дзеля выработкі закона аб выбарах у установчы сойм Беларускай Народнай Рэспублікі.

+ На моцы пастаноў Рады Б. Н. Р. з 12 і 14 красавіка, у склад Рады увайшлі ўсе члены Менскага Прэдстаўніцтва: Р. Скірмунт, А. Ўласаў, генэрал Кондратовіч, протоерэй Кульчыцкі, кс. Годлеўскі, П. Алексюк, К. Годыцкі Цьвірка і інш.

+ Замест захварэўшага члена Рады ад польскай фракціі местовай думы, Янчэўскага, выбран член менскай управы, Цывінскі.

+ Камісія Рады Б. Н. Р. дзеля выработкі наказу апрацавала плян папаўненьня Рады прэдстаўнікамі беларускіх паветовых рад. Гэтак аканчацельнае чысло членаў Рады павінно дайсьці 80.

+ С прычыны пастановы Рады аб рэорганізаціі Народнага Сэкрэтарыату на аснове коаліціі у число членаў яго маюць увайсьці прэдстаўнікі цэнтру Рады: Р. Скірмунт, П. Алексюк, а такжэ новапрынятые члены Рады Я. Лёсік і інш.

+ Гэтымі днямі Рада пераходзіць у новае памешчэньне, спэцыяльна прыгатаванае дзеля Рады і Народнага Сэкрэтарыату. Гэта — так-званы «Юбілейны Дом» на Архірэйскай гарэ.

Будаваньне Бацькаушчыны.

Час слоў, час гутарак аб будучыне нашае Бацькаўшчыны, як аб нейкай далёкай-далёкай справе, ўжо мінае: незалежна ад таго, ў *якой форме* уложыцца новае жыцьцё Беларусі і народу беларускага, мы ўжо напэўна можэм сказаць, што будучае жыцьцё нашэ будзе апірацца на зусім *новых асновах*, і гэтые асновы мы павінны збудаваць самі—*сваімі рукамі*. Гэтак наступае пэрыод вялікай і цяжкой працы — гасударственага будоўніцтва.

Кожная старонка, кожын народ мае свае асобеннасьці, каторые вымагаюць дапасаваньня да іх форм дзержаўнага жыцьця. Цяжкая доля таго народу, каторы утраціўшы ўласную дзержаўнасць, вытварэную векамі, падпадае пад уласць чужога гасударства і прымушэн сам дапасоўвацца да чужых дзержаўных форм. Гэта мы ужо спазналі на сабе, пражыўшы больш за 120 гадоў пад маскоўскім панаваньнем. Вось-жэ, прыступаючы цяпер да адбудовы свайго гасударства, мы павінны пільнавацца, каб яно, як сьлед, адпаведало патрэбам і нацыональным асобеннасьцям нашага народу.

Будуючы гасударствены лад на нашай зямлі, мы перш за ўсё угледаемся на тое, што ў нас ужо ёсць. Кінуўшы вокам на адзін і на другі бок старога ваеннага фронту, разрэзаўшага Беларусь, мы бачым, што на заход ад яго вайна знішчыла ўсю грамадзкую і адміністрацыйную організацію краю. Ад старога расейскага гасударственага мэханізму не асталося блізка нічога. Окупацыйные уласьці устанавілі тут своё дачэснае ваеннае упраўленьне. І цяпер з гэтага боку фронту прыходзіцца пачынаць організацыйную работу ад самага пачатку, ладзючы організацію сельскіх грамад, паветаў, мест і ўрэшці цэнтральных установ, заводзячы школьную сець, суды, адміністрацію, організуючы дарожные, пачтовые, тэлеграфные зносіны і т. д. І пасьля ліквідаціі вайны, як вернуцца да родных мейсц адарваные ад іх маскалямі сыны нашае Зямлі, закіпіць жыва работа над будаваньнем папраўдзі беларускага нацыональнага жыцьця, *не сустрэчаючы ніякіх прашкод, зьвязаных з бышым расейскім упраўленьнем*: сьледоў яго зусім не асталося.

Іначэй стаіць справа ў усходняй Беларусі—па той бок ваеннага фронту. Там яшчэ задаўна да вайны было заведзено земскае самаупраўленьне, якога ў Віленшчыне і Гродзеншчыне не было. І адход расейцаў з Беларусі ў Меншчыне, Магілёўшчыне, Вітэбшчыне не зруйнаваў земств, ня знішчыў нават старых гасударственых установ, як суды, школы, адміністрацыйные урады, почта і тэлеграф, упраўленьне чыгункамі і т. п. Усё, як было, так і асталося. З гэтае прычыны беларусам тамака было шмат лягчэй узяць у свае рукі ўласць на сваей зямлі і, стварыўшы цэнтральны гасударствены урад—Раду Беларускай Народнай Рэспублікі і Народны Сэкрэтарыат, кіраваць далей усім жыцьцём краю,—ведама, дапасоўваючы *расейскіе* дзержаўные установы да патрэб *беларускіх*. Але якраз у гэтым *дапасовываньні*—найвялікшая труднасць.

Справа вось у чым. Ня гледзячы на шыбкі узрост беларускага нацыональнага руху ў закордонней Беларусі ад часу упадку царызму, ня гледзячы на тварэньне беларускіх нацыональных войск і на массу ніжэйшых служачых у адміністраціі—беларусаў, маскоўскае панаваньне не магло зразу утраціць сваей сілы. Як і даўней, агульны характэр упраўленьня быў маскоўскі, а „дэмократызм“ большэвікоў выявіўся ў тым, што ў валасных, паветовых і губэрскіх земствах яны навязывалі беларускім селянам розных чужых нам людзей — парэважна вялікарусаў, а то і латышаў (менскі камісар Ландэр) і іншых. Усё гэта рабілося бытцым-то „дзеля карысьці беларускага народу“. Дзеля тэй жэ „карысьці“ далей былі чынны маскоўскіе школы, панавала ўсюды маскоўская мова. Большэвікі не прызнавалі Беларусі за асобны край: для іх гэта была толькі „област'“ Расеі. І цяпер, калі панаваньне большэвікоў скончылося, калі утварылася беларуская гасударственая ўласць, сьляды маскоўшчыны ня счэзлі: Рада Беларускай Народнай Рэспублікі і Народны Сэкрэтарыат павінны напружаць усе свае сілы дзеля бараць бы з маскоўскай спадчынай, каторая глыбока ўелася ў душу нашых больш культурных элемэнтаў... Са школ, з земств, з усіх урадаў трэба выганяць чужацкі дух і ўліваць свой — беларускі. Расейскіе школы трэба абярнуць у нацыональные беларускіе. Навязаные большэвікамі маскоўскіе элементы з земств трэба выжэнуць. Па ўсіх паветах, валасьцёх і іншых цэнтрах трэба закладаць *беларускіе рады*, зложаные не с чужынцаў, а са сваіх людзей, сьвядомых беларусаў і шчырых сыноў сваё Бацькаўшчыны. Толькі такім спосабам можна будзе прыгатаваць грунт для ладжэнай *беларускай* гасударственасьці. Толькі гэтак пры будове беларускай дзержавы ў фундамэнтах яе не акажэцца чужацкіх каменьняў, каторые, скора выветрыўшыся, лёгка маглі-бы вызваць развал усяе гасударственай будоўлі.

І. Мелешка.

Правапіс і Граматыка.

(Гл. № 31).

Аканьня *е*. П. А. Луцкевіч у сваёй кніжцы „Як правільна пісаць па беларуску?“ устанавіў правіла, па катораму неакцэнтаванае этымолёгічнае *е* **толькі тады акае, калі яно стаіць перад акцэнтаваным складам і ў гэным, акцэнтаваным складзе няма зыку** *а*.

С тым, што неакцэнтаванае *е*, стоючы перад акцэнтаваным складам, каторы сам не *а*, акае — ўсе згаджаюцца. Дзеля таго, што з гэтым усе згаджаюцца, мы гэтага даводзіць ня будзем, толькі разгледзім, **ці толькі ў гэтым здарэньні неакцэнтаванае** *е* **акае?** Хочучы ляпей разабрацца ў гэтым, я зьбіраючы і запісываючы словы з неакцэнтаваным этымолёгічным *е*, каторыя не падходзюць пад правіла А. Луцкевіча дзяліў, іх на групы і вось да чаго дайшоў:

Словы перад, цераз і пераз кажуцца з акцэнтам на канцы і пад акцэнтам чуецца *а*: перàд, церàз, перàз. Могуць сказаць, што акцэнту на гэтых кароткіх словах зусім не бывае, што ён пераходзіць на суседняе чароднае слова. Няхай сабе, але ўжо тое, што на гэтых складох у той самы час чуецца акцэнт і *а* даводзіць якое вялікае і цьвярдое аканьня ў іх. Апрача таго, словы: перад і пераз у скарочэнай форме ўжываюцца прад, праз і нікому с пішучых па беларуску удум нават ня прышло, каб можна было іх, пішучы асобна, напісаць з *э*: прэд, прэз. А калі ў скарочанай форме ёсць *а* пасьля *р* дык яно будзе і ў поўнай форме. Значыцца, калі словы перад, цераз, пераз стаяць асобна, дык заўсёды трэба пісаць пасьля *р а*.

Далей у чародных групах слоў неакцэнтаванэе *е* пераходзіць у *а*:

1) У першым складзе пасьля акцэнтаванага ў двускладовых словах з двума этымолёгічнымі *е*: верэд, вечар, чэрап, дзеля, вецяр, *) бераг, верас і г. п.

2) У першым чародным складзе пасьля акцэнтаванага, калі акцэнтаваны склад не *а*: восянь, дросянь, дужасць, тыдзянь, почапка і г. п.

3) У чародным складзе пасьля акцэнтаванага, калі акцэнтаваны склад *а*: паляц, закаляц, характар і г. п.

4) У другім і далейшых складох пасьля акцэнтаванага: верасянь, оталапянь і г. п.

5) У папяраджаючым акцэнтаваны склад з зыкам *а*: цана, шарак, чапяла, чапаць, чакаць, кляпаць, дзяжа, жарства, жанаты, рака, зямля, страла, дзяржаць, дзяржальня (а значыцца і дзяржава), сям'я, мяжа, трапачка і г. п. з дзядамі, з цапамі і г. п. кураняты, гусяняты, качаняты, і г. п.

Прадстаўнік — слова робляное. Зробляно яно, мне здаецца, добра. Але зробіўшы яго па пробцы маскоўскага ці польскага падобнага слова, ў нас ніяк не адважуцца пісаць яго праз *а* і, ведама, як нам пісаць *а*, калі маскоўцы пішуць *е*? Я. Лёсік, каторы дзяржыцца вялікага аканьня, пішучы цана і г. п. ў стацьці «Наш правопіс» № 4 „Вольнае Беларусі“ кажэ: «Трэба пісаць: *перад, прэд, без, чэраз, цераз* напрыклад: *пер*апісаць, *прэд*стаўнік, *безм*ежны». Чаму, на якой аснове? У словах перад, цераз, пераз, пера *е* пасьля *р* падлягае агульным законам аканьня, так сама як і ў словах прад, праз і без.

6) У другім складзе перад акцэнтаваным складам: чалавек, царабіць, цянюціць, сярадня, чатырнаццаць, лянавацца, страляніна, разнікі, сядзяны, лясьнікі, паюны, дзяцюкі і г. п. Вынятак: Серада трэба пісаць *е* пасьля *с*, бо ў некаторых мясцох на *се* бывае акцэнт.

7) У трэцім складзе спераду ад акцэнтаванага: вялічыня, цялюкаваты і г. п.

8) Узменшаных найменьнях (іменьніках) жаноцкага роду, як: кашулячка, сарочачка, матулячка, Ганулячка, птушачка і г. п., а таксама мужчынскага і сяр. роду с падобнымі канчарамі: татулячка. вочачка.

9) Мужчынскага роду зменшаные ў другой ступені, як: каточак, сыночак, садочак і г. п.

10) У першым прыпадку мн. лічбы прыметнікаў і займеньняў (мѣстоим.) усіх родаў чуецца *я*: гэтыя белыя сталы, сьцены, вокны.

Я трэба пісаць на канцы такіх найменьняў, як: здарэньня, чытаньня, пісаньня і г. д., бо *я* ў гэткіх словах на канцы выразьліва чуецца Наагул у найменьнях на *ньня е* ў канчары нічым ня розьніцца ад *э* у «мора» «сэрца» і г. п. Як у тых, так і ў другіх утраціліся пачуцьцё розьніцы ад жаноцкага роду, што відаць з канчароў першага прыпадку множнай лічбы на *і, ы*: моры, сэрцы, здарэньні, чытаньні. Словы з гэткімі канчарамі ёсць у украінскай мове і украінцы пішуць іх праз *я*, а мы ўсё азіраемся на „правільные“ мовы.

Таксама дзеля фонэтыкі трэба на канцы *а* пісаць у найменьнях павялічаных, як: лужышча, торжышча і г. п.

Беларуская мова ня любіць *е*; замест *е* найчасьцей бывае *а*, а часам *і*. Толькі адно (з 6-ёх) усходня — паўночнае нарэчча беларускае мовы ікае або ыкае, захоўваючы аканьня неакцэнтаванага *е* і *о* ў тых мясцох, дзе яны не пераходзяць у *а*.

*) Цікаўна, штэ ў некаторых мясцох у слове вяцяр ёсць акцэнт на канцы.

Максім Гарэцкі.

АНТОН

(Абразы жыцьця).

(Гл. «Гоман» № 33).

БЕЛАРУСКІ АУТОР. Паны, паны! Вы не кіраваліся зразумець, і вам не зразумело... А чаму ж мне, беларусу, і беларусу-рабынічу, бо бацька мой служыў прыгон, чаму мне саўсім па духу і зразумело як мессіанство польскага народу, так і кіраваньне да Бога і чуда народу рускага па Дастаеўскаму, і гэтые староверы, і сектанты, духаборы і далі і далі

МАСКОУСКІ ДЭМАКРАТ і ПОЛЬСКІ ПУБЛІЦЫСТ. Чаму? Ад чаго?

БЕЛАРУСКІ АУТОР. Чаго? А таго, што я сын свайго народу... а народ мой,—народ паэт, народ-лірнік, народ, каторы у гістарычным жыцьці сваім заўсёды больш схіляўся к патрэбам душы, чымся к патрэбам цела. Сілай духа свайго ён ўладаў над крэпкімі і страшнымі ваякамі - літоўцамі, што заваевалі яго фізычна. Вялікімі скарбамі сваей паэтычна-чэлавецкай душы ён праз вякі дзяліўся с Польшчаю і карміў Маскоўшчыну. Дзеля цела у жыцьці ён дабіваўся хлеба штодзеннага, а дзеля душы ён шукаў і шукаў без канца і стварыў цікавейшую гісторыю, багатую не заваеваньнямі другіх народаў, а заваеваньнямі духа, заваеваньнямі ў вызучэньні самага сябе... Толькі ён ня любіў запісываць, паказываць, выстаўляць. Успомніце змаганьня хрысьціянства с паганскай верай, а потым вялікі рух у справах веры у пазьнейшые часы, кальвінізм, служэньня акультным навукам, езуіцтва, унія... Цяпер у майго народа крызіс: старые багі струпехлі, а новых... новые мала ведамы... І сусьветна новые багі, багі цела, багі што даюць ці могуць даць поўнае здаваленьня толькі целу, гэтые багі не надта падабаюцца беларусу... І вот, каб стварыць тып „новага беларуса“, каб угадаць, якім павінен ён быць і будзе гэты ўладар будучыны, трэба памірыць у душэ беларуса старое з новым, трэба вышукаць, што у яго душэ жывуча са старыны і на чым будаваць новае... Трэба шукаць прычыны крызыса, бо п'янства, непісьменнасць, бяднота—ўсё гэта абставы крызыса... А мы шукаім прычыны...

МАСКОУСКІ ДЭМАКРАТ. А па-мойму адказ адзін: ня вытрываў агульна-народнага крызыса гэты селянін Антон праз тое... Не, не так... Ніякага асаблівага крызыса й німа—зарэзаўся, бо дзяды былі алкаголікі, а ён ня піў, ды хоць бы й піў...

ПОЛЬСКІ ПУБЛІЦЫСТ. (да беларускага аўтара). Выбачайце паночку, — вашы думкі дужа цікавы, але троху заплутаны і па праўдзі парадоксальны.. Гісторыя, прыгоншчына, псіхіка, абасабленьне і зніштажэньне інтэлігенцыі і тое, што не у народа, а у інтэлігенцыі і у часьці народнай маладзёжы німа веры і сьвятых заданьнёў, усё гэта радзіло адно другое, ішло адно за другім і магло косым бокам памагчы Анто-

цюць у *і*, *ы*. У рэшты ж Беларусі іканьня вялікага няма. Аднак у некаторых словах на ўсей Беларусі часта замест *е* чуецца *і*, пры гэтым часта ў адным слове, на тым самым месцы, нават той самы чалавек вымаўляе замест *е* то *і*, то *я* Установўліваючы тое ці іншае правіла для *е*, мы павінны зьвярнуць увагу не на іканьня аднаго с 6 ёх нарэччаў, а на іканьня ўсяе беларускае мовы. Тые склады, у каторых прынамсі на вялікшай часьці Беларусі чуваць то *і* то *я*, а часам *е*, трэба пісаць праз *е*, як зык сярэдні, каторы дае магчымасць вымаўляць і *е*, і *я*, і *і*.

Выходзючы з гэтага пагляду трэба пісаць *е*:

1) У другім складзе (ад канца) слоў: пера, перад, цераз, пераз, бо ў гэтых скпадах чуваць то *і*, то *я*, *а*, а часам і *е*.

2) У найменьнях ласкавых на *-йка*: лецейка, брацейка, гараванейка, але у гэтых жэ формах пасьля шыпячых *і р* выразна чуецца *а*, дык пасьля іх у гэтых формах належыць і пісаць *а*: прыгорайка, збожжайка.

Ласкавыя найменьні на *ітка* трэба пісаць праз *і*, бо *толькі* і ў гэтых канчарох чуецца: брацітка.

3) У ласкавых прыметнікаў на на *-нькі* і нарэччаў на *-нька*: сіненькі, родненкі, салодзенькі, чорненка, чырвоненька, але ў тых жэ формах пасьля шыпячых і *р* чуецца *а*: скоранька, добранька, дужанькі, добранькі. Аднак патрэба пісаньня *а* ў скоранька, добранька і г. п. для мяне ня зусім ясна, мо' ў гэтых формах пасьля шыпячых і *р* трэба пісаць *ы*, каторае ў некаторых словах толькі адно чуецца: шэрынькі.

(Канец будзе).

Уставай!

Ударыў звон, панёсься кліч,
Магутны кліч ад краю ў край:
Усяк, хто сьпіць, ўставай! ўставай!
І распаляй народны зьніч!..

Чырвоны ў небі відаць знак —
То пачынаецца зара.
Спаць ў такі момэнт не пара!
Хай праціраe вочы ўсяк!..

Бо трэба хату будаваць,
Трэба хутчэй рубаці зруб,—
Хто толькі жыў, хто йшчэ ня труп,
Ратуй сваю старонку-маць!

Хоць ўсё трашчыць, валіцца зноў,
Работы з рук ты не кідай!
Бо Беларусь—твой родны край,
Аддай яму свой пот і кроў...

Ударыў звон, пранёсься кліч,
Магутны кліч ад краю ў край,
Па сэрцах сьпячых, бытцым біч,
Ён сьцебануў: пара! ўставай!.

Я. М.

У Вільні і ваколіцах.

× **Аб паварот уцекачоў-беларусаў.** Беларускі Цэнтральны Саюз Нацыянальных Грамадзкіх Організацій на заседаньні 21 красавіка разгледаў справу хутчэйшага павароту уцекачоў-беларусаў да родных мейсц. Было выясьнено, што справа гэта — страшэньне шпешная, бо калі ўцекачы-селяне ня будуць пушчэны ўразжэ, дык не пападуць на час работ у полі, якіе ўжо пачынаюцца. Выбрана камісія с 4 асоб, каторай даручэно зьвярнуцца ў гэткай справе да нямецкай уласьці.

У гэтай жэ справе сэкрэтар Беларускай Народнай Рэспублікі зьвярнуўся да Беларускага Камітэту помачы пацярпеўшым ад вайны с просьбай учыніць патрэбные крокі дзеля дапушчэньня дамоў уцекачоў беларусаў з Гродзеншчыны і часьцей Віленскай і Менскай губэрні у межах старой окупацыі.

С прычыны таго, што пры павароці ўцекачоў да хат патрэбна апека на мейсцы, а пры цяперашніх варунках зносіны між Вільняй і правінцыей вельмі цяжкіе, былоб вельмі важна, каб беларускіе грамадзкіе працаўнікі у правінцыі загадзя прыгатаваліся да сустрэчы ўцекачоў і аказаньня ім патрэбнай помачы.

× **Беларускі тэатр.** Назначэнае на 28 красавіка ў Беларускім клюбе прэдстаўленьне „У зімовы вечэр" адкладываецца. Аб дню спэктаклю будзе апавешчэно ў „Гомане".

× **Аб отпусках ваеннапалонных.** С прычыны чысьленасьці просьб жыхароў нашага краю аб одпуск на пабыўку ў хаце іх сваякаў — ваеннапалонных з асьведомленай крыніцы наказываюць, што гэткіе просьбы ня могуць быць споўнены с прычыны немагчымасьці правозу. Рабіць выключэньні для паадзінокіх людзей было-бы несправядліва. Людзі павінны толькі цярпліва ждаць моманту, калі іх сваякі будуць зусім звольнены з палону.

× **Фальшывые рублёўкі.** Фальшывые «нямецкіе» аднарублёкі з'явіліся на грашавым рынку. Важнейшые знакі іх: у польскім тэксце аб карах за фальшаваньне замест слова «będzie» ў пятым радку стаіць „bębzie" значыцца замест d—b. Апрача таго, папера не мае вадзянога знаку.

× **Нешчасліваe здарэньне.** Анастасія Шантыр (Кальварыйская 21), хочучы лепш прыглядзецца пажару, каторы быў у начы з 23 на 24 красавіка на Сніпішках, узлезла на плот, ды звалілася з яго і разарвала сабе аб цьвек нагу ад ступні ажно да калена. У карэтцы скорай помачы адвезьлі яе ў бальніцу ў местовай салі.

× **Пажар.** У начы з 23 на 24 красавіка быў пажар на Дэрэвніцкай вул. Ад куршлюсу (злучэньня эляктрычных дротаў) загарэлася сценка ў стайні. Адзін будынак згарэў зусім, другі суседні, каторы пачаўся ужо гарэць, пажарнікі адратавалі. Працавалі ўсе аддзелы віленскай пажарнай старожы. Пажар пачаўся а 10 гадз. веч., кончыўся а 3-ай на ранку.

× Тэмпэратура. Найвышэйшая і найніжэйшая тэмпэратура за апошніе дні была (па Цэльсію):

	найвыш	найніж.
21 — 22	+ 21,5°	+ 8,9°
22 — 23	+ 21,3°	+ 6,1°
23 — 24	+ 19,0°	+ 2,5°

З усяго Краю.

З Менскага жыцьця.

З дайшоўшых да нас менскіх беларускіх газэт даем гэту вязанку вестак:

= **На работы ў Нямеччыну** записалося 35.000 душ. Праз тыдзень запіс мае ўжо скончыцца.

* * *

= **З'езд праваслаўнага духавенства.** У маі месяцы мае адбыцца з'езд прэдстаўнікаў духавенства і міран у справе духоўнай сэмінарыі, с каторай з будучага году хочуць стварыць 8-мі клясовую хрысьціянскую гімназію з багаслоўскім інстытутам.

На гэтым жэ з'ездзі маюць разгледзіць пытаньне аб грошы на утрыманьне архірэйскага дому, аб матэр'яльнае становішчэ духавенства, выясьніць пазыцыю духавенства, якой яно павінно трымацца ў сучасным момэнце, і шмат іншых пытаньняў.

Дзеля падгатоўкі ўсей гэтай работы на з'ездзі ў панядзелак, 15 красавіка, ў духоўнай сэмінарыі адбылося арганізацыйнае сабраньне с прэдстаўнікаў кліру.

Загадзя мае быць паслана дэлегацыя ў Маскву на царкоўны сабор за рожнымі спраўкамі і інформацыямі дзеля будучага з'езду.

* * *

= «**Беларуская Хата**» на Конным пляцу ў 3 часьці гэтымі днямі наладзіць ужо кінэматограф, маючы культурные і прасьветные ў гэтым мэты. Кінэматограф будзе асобна для сталых і асобна спэцыальна для дзяцей.

Вельмі важна былоб, каб поруч с прэдстаўленьнямі для дзяцей былі тлумачэньня тых абразоў, якіе бачуць перад сабой дзеці.

У той жэ «Беларускай Хаце» будуць тэатральные прэдстаўленьні, а так жэ сама клюб, статут катарага ўжо прыняты сябрамі клюбнага таварыства.

Апрача таго, на пляцу — каля хаты — будуць наладжэны розные гульні, як кракет, тэніс, гарадкі і іншые.

Трэба спадзевацца, што загадчыкі новай культурнай беларускай пляцоўкі патрапяць споўніць тые вялікіе заданьні, якіе сапраўды вымагае культура.

* * *

= На курсах беларусазнаўства чытаюцца цяпер лекцыі з гэткіх курсаў:

Д-р Массоніус — Гісторыя беларускае мовы.

Станіслаў Ленкоўскі — Гісторыя беларускага права.

Язэп Варонка — Беларусь і яе суседзі.

Т. Грыб — Нашы песьняры і іншые.

* * *

= Беларускае выдавецкае т-ва „Заранка" ў Менску апавешчае, што яно мае на мэці выдаваньне кніг для пачатковай школы, для студэнтаў і вучняў вышэйшых школ, а так сама для шырокае публікі. Поўнапраўнымі сябрамі лічацца асобы, заплаціўшые 100 руб. Яны маюць права пастанаўляючага голасу і адказваюць за справы т-ва. Непоўнапраўные сябры ўносяць ня менш 15 руб., карыстаюць с права дарадчага голасу і адказваюць за справы т-ва толькі сваім паем. Старшыня т-ва — П. Алексюк, скарбнік — К. Цьвірка-Гадыцкі, пісар — А. Уласаў.

* * *

= **Зямельные камітэты** (губэрскі, паветовы і валасные) паводлуг праекту нямецкай улады маюць заняцца падгатоўкай зямельнай рэформы.

Разумецца, што тые зямельные камітэты, якe мелі нахіл. к большэвізму, разагнаны і на іх мейсцо назначэны новые. Найбольш такіх разгонаў было ў барысаўскім павеце.

* * *

= Як піша «Беларускі шлях» у № 20 с 16.IV., **Камандуючы нямецкім войскам** выдаў прыказ:

«Усё безпраўна забранае з двароў і фальваркаў, як інвэнтар, жывёла, насеньне, харчы, гаспадарскіе машыны і прылады, дрэва і інш. заразжэ павінно быць зьвернено ўласьнікам

„Уселякіе споркі разбірае суд, зложэны з аднаго селяніна, аднаго памешчыка і судзьдзі — як прадседацеля. Судзьдзяў назначае на-

ну зарэзацца, але тое, ад чаго ён зарэзаўся, яно таксама радзіцца магло і радзілося ад прычын, што я казаў, але яно цяпер глаўнае і самастойнае і гэта ёсць—соціальноэканаміцкая немажлівае у нашы часы. Ен ня меў чаго есьці...

МАСКОУСКІ ДЭМАКРАТ. Скажу я, красамоўцы мае, усі мы троху забалбаталіся. Унукі нашы знайдуць прычыны і разглядзюцца у нашых часох, а мы дужа блізкі да сваіх часоў, і калі што паднесць к самым вачам—нічога ня ўвідзіш... Адно я знаю і буду гаварыць: літэратура ваша, беларуская, не марудзячы павінна выявіць беларусам новага чэлавека—беларуса, вот і ўсё...

ПОЛЬСКІ ПУБЛІЦЫСТ. І вера новага чэлавека будзіць новаю вераю, і сьвятые заданьня новага чэлавека будупь новымі сьвятымі заданьнямі для вашых маладых і адраджоных... Стварыце новага чэлавека!

МАСКОУСКІ ДЭМАКРАТ. Бярыцеся, дзядзька, за пяро і пішыце раман „Што рабіць?.."

БЕЛАРУСКІ АУТОР. Дзякую за добрую раду... Шкада, што яна дзеля мяне ня нова.. Жыцьнё дасць атказ..

МАСКОУСКІ ДЭМАКРАТ і ПОЛЬСКІ ПУБЛІЦЫСТ. Эх, вы, песьняр селянскага здаровага народа! Адразу відаць псіхіка беларуса! Ды што вы: „жыцьцё... жыцьцё..." Вы самі тварыце жыцьцё!

БЕЛАРУСКІ АУТОР. А што вы думаеце? І створым! І створым...

МАСКОУСКІ ДЭМАКРАТ і ПОЛЬСКІ ПУБЛІЦЫСТ. О, о! Так, так... Вялікіе словы, каб даў Бог і працу..

БЕЛАРУСКІ АУТОР. А так! Уцямім прычыны і дадзім новага чэлавека, бо уцяміць прычыны—ўжо стаў троху новым...

У сусьветнай літэратуры творы ў каторых паказываліся аднаму якому грамадзянству новые шляхі жыцьця, новые заданьня, такіе творы больш, чым другіе дачасны і скора забываюцца новымі пакаленьнямі. Але значэньне такіх твораў, што казаць, аграмаднае, і калі у іх уплесць агульна чэлавецкіе пытаньня, яны ня скора патрапюць у Лету.

МАСКОУСКІ ДЭМАКРАТ. Да чаго вы гэта?

БЕЛАРУСКІ АУТОР. Так... паміж іншага... А ніхай плачым, апеваім нядолю — шукаім добрых заданьняў... Ня можна ж адразу стварыць сабе ідэал... Што? Не? Ідэал, што хутка дасьцiглы — не вялікі ідэал... І наагул — дайшлы ідэал — не ідэал... Што? Вядомые праўды? Ну...

А вот, паночкі, ўся вага і значэньне вашых слоў — гэта творамі паддаць сілы, энэргіі, імпэту... так. Ды й песьняры нуды, смутку часта дабіваліся сваімі песьнямі саўсім наадваротнага... (Дзынг, дзынг, дзынг!) Дайце тры шклянкі вады і «Нашу навіну...» А ўжо пара, ведаіце, і да хаты...

ПОЛЬСКІ ПУБЛІЦЫСТ А так... Што іграюць?.. Вы не знаёмы с тым, вун сеў...

МАСКОУСКІ ДЭМАКРАТ. А я ўсё думаю, цікава б было паехаць туды, на тое сяло, гдзе гэты селянін-самагубца... Распытацца б...

(Далей будзе).

чальнік воласьці. Апэляцыю можна падаваць паветоваму начальніку. Пастановы павятовага начальніка павінны быць спаўняны, інакш можэ быць арышт, або турма.

Уся ворная земля на якой можна спадзевацца поўнага ураджаю павінна быць засеяна

Усе землеўласьнікі, або іх камісары павінны зараз-жэ вярнуцца і ўзяцца за гаспадарку. Калі гэта ня будзе зроблено праз 8 дзён,—10.000 рубл. штрафу, а калі яшчэ праз 6 дзён ня возьмуцца за работу, то гэта будзе зроблено на рахунак землеўласьніка.

Апрача таго, земля каторую сам гаспадар ня здолее засеяць, будзе засеяна прымусовым спосабам.

* * *

= **Пропускі уцекачом** часова затрыманы пакуль немцы акуратна не апрацуюць парадку і чароду самага выезду і напрамку па чыгунцы.

* * *

= **Нямецкай уладай** зроблена заява гарадзкой думе не выдаваць ніякіх абавязковых пастаноў.

Так сама замест выбарных судзьдзяў, як гэта зрабіла гарадзкая дума, маюць быць судзьдзі па назначэньню.

* * *

= **Рэгістрацыя быўшых паліцэйскіх служачых** мае адбыцца ў хуткім часе; ім будзе запрапанована атпаведная служба ў міліцыі. Некаторым быўшым паліцэйскім ужо давалі мейсцы, але тые зважаючы на непэўнасць у будучыне,— адмаўляюцца. Свабодные мейсцы камісараў і іх памочнікаў будуць запрапанованы афіцэрам.

* * *

= На 25 красавіка ў Менску мае адбыцца конфэрэнцыя Менскага Беларускага Прэдстаўніцтва.

* * *

= **Цэны ў Менску 16 красавіка:**

1 ф. хлеба	2 р. 20 к.
„ „ солі	1 р. — —
„ „ рыбы	4 р. 50 к.
„ „ каўбасы простай .	4 р. 50 к.
1 кв. млека	1 р. 50 к.
10 яек	5 р. 50 к.

ВЕСТКІ З РАСЕІ.

ВЕНА (В.Т.Б.). С пэўных крыніц наказваюць, што большэвіцкі урад пайшоў па дарозі мілітарызму. Троцкій дамагаецца, каб кожын грамадзянін быў салдатам і на першы кліч выступіў з аружжэм бараніць бацькаўшчыну. Нават Ленін пакінуў барацьбу з мілітарызмам і лічыць канечне патрэбнай адбудову расейскай арміі. Каб даць арміі патрэбнае чысло афіцэраў, адкрываюцца ізноў усе ваенные школы.

ПЕЦЯРБУР (Рэўтэр). Большэвіцкі урад уложыў бюджэт на першую палову 1918 году, вылічыўшы выдаткі на 24½ мільярды рублёў. Камісар дзеля фінансаў заяўляе, што на гэта нет магчымасьці здабыць патрэбные грошы.

РОТТЭРДАМ (В.Т.Б.). «Daily News» наказвае:

Сіла большэвіцкага ураду с кожным днём узрастае. Пад Новочэркаскам урадовые войскі разагналі ворагаў. Ходзяць чуткі, што Семёнов і Корнілов пагіблі.

МАСКВА. Японскі консул высказаў у міністэрстве заграпічных спраў нездавольства с прычыны тэндэнцыйных вестак расейскіх газэт, трывожачых народ. Консулу было адказано, што найлепшы спосаб супакоіць народ — гэта вывясьці японскіе войскі з занятых расейскіх зямель.

Заграпічнымі справамі расейскага ураду кіруе цяпер Карахан, б. член расейскай дэлегацыі у Брэст-Літоўску.

МАСКВА. Маршалак рэволюцыйнага трыбуналу, Зорін, падаў расейскаму ураду матэр'ялы досьледаў аб цару Мікалаю. Быўшага цара вінавацяць у чысьленых нарушэньнях Кунстытуціі, зацьверджэньні прысудаў, каторые станавілі акты палітычнай помсты, у ленскай трагедзіі, у здарэньнях 9 студня і „ублутаньні Расеі ў сусьветную вайну, ў якой утрацілі жыцьцё мільёны людзей“.

З усяго сьвету.

БЭРЛІН. С прычыны заняцьця Владывастоку японцамі «Vossische Zeitung» пішэ: Мы маем данные, што гэта сталося пасьля доўгіх перэгавораў між саюзьнікамі і Японіей. Мы ведаем, што японскіе жаданьні ідуць шмат далей. Пачатковые жаданьні Японіі заняць усё рускае узбярэжжэ Ціхога акіану пэўня пад націскам саюзнікаў адложэны.

ГААГА. 22.IV. (В.Т.Б.). На заседаньні камісіі верхняй голяндзкай палаты прэдстаўнік ураду заявіў: «Ідэя утварэньня лігі народаў, каб зробіць мір цяпер разглядаецца ў тэй камісіі, каторая калісь стварыла трэцюю мірную конфэрэнцію“.

АМСТЭРДАМ (В.Т.Б). Чысло асоб у Ірляндзіі, каторые на прэдлажэньне біскупаў і палітычных дзеячаў абецаліся працівіцца ваеннай павіннасьці, паводлуг прыватных вестак, даходзіць ужо 3 мільёнаў. Ірляндзкіе работнікі, працаваўшые у Англіі, кідаюць там работу і вертаюцца у Ірляндзію, лічучы, што там яны будуць забаспечены ад ваеншчыны. Каб падтрымаць у Ірляндзіі парадак, уласьці загадываюць самые становучые крокі. Ждуць закрыцьця унівэрсытэтаў і вышэйшых школ. Жыхары вялікіх мест сьпешаюцца пакінуць іх і едуць у правінцію.

ЛОНДОН (В.Т.Б.). З Ірляндыі наказываюць: ваенные ўласьці ўзялі ў свае рукі ўпраўленьне жалежнымі дарогамі, почтай і тэлеграфам.

ЛОНДОН (В.Т.Б.). У Дубліне ў тую нядзелю на мітынгах сабралося 100.000 ірляндцаў. Глаўнакамандуючый Фрэнч сам кіруе ваеннымі крокамі дзеля паддзяржаньня ладу. Ў Дубліне спыніўся рух на чыгунках і трамваях.

ЛЮГАНО. Газэты аднагалосна жалюцца на нястачу жыцьцёвых рэчаў. Прычынай нястачы адкрыта завуць падводную вайну.

Позьні сьнег с сьцюжай паменшыў шансы сёлетняга ўраджаю. Памочнік статс-сэкрэтара Крэстпі заявіў:

„Сягоньня наш ураджай без мала зусім з'едзены. Аб палажэньні збажжовага рынку ў чэрвені я вельмі трывожуся. Трэба гаспадарыць ашчадна з вялікім паменшэньнем ужываньня.

БЭРЛІН (В.Т.Б.). Боўгарскі пасол Рызов памер ад разрыву сэрца.

ТЭЛЕГРАМЫ.

Нямецкіе апавешчэньня:

23.IV. Заходні тэатр:

На поле бітвы час ад часу артылерыйская бітва і мейсцовые пяхотные прэдпрыемствы. Між Ленс і Альбэр жывые разведкі англічан. Ля лесу Авельмі і на абапал чыгункі Бузэнкур-Авельмі шматразовые штурмы англічан злаіаліся з вялікімі стратамі. Мы ўзялі палонных.

За апошніе два дні зьбіты 30 варожых самалётаў.

Усход.

Македонскі фронт.

Між Охрідай і Прэсбай артылерыйскіе і мінные бітвы. Узяты палонные французы і англічане.

24.IV. Заходні тэатр:

На палёх бітв на Ліс і Сомме —мейсцовые бітвы. На паўночным усходзі ад Байель мы здабылі вяршыны і ўзялі палонных. Сільные наступленьні пры Бэтюн спынены на нашых пярэдніх лініях. У розных пунктах на фронці ў часе разведак узяты палонные.

Усход.

Фінляндзія. Нашы войскі занялі жалезнадарожные вузлы Гэвінг і Рыгімэкі і на поўначы ад Ляті злучыліся з Фінляндзкай арміей.

КАЛЯ ВАЙНЫ.

БЭРЛІН. **Урадова.** У начы з 22 на 23 красавіка англічане пачалі вялізарную опэрацію проці узбярэжжа Фляндрыі Часць англіцкіх марскіх сіл выступіла проці Остэндэ і Зээбрінгэ і зрабіла спробу высадзіць тамака войска, каб знішчыць ваенные будоўлі. Вышоўшые на бераг англічане былі часьцю пазабіваны, часьцю ранены. 5 англіцкіх крэйсэраў затоплены ля самага берагу. Апрыч таго затоплены 3 контрміналосцы і шмат маторных лодак. Нашы шкоды ў матэрыалах і людзёх—незначные.

ЛОНДОН (Рэўтэр). Опэрація проці узбярэжжа Фляндрыі мела на мэці зачыніць выходы с портаў Остэндэ і Зээбрінгэ напоўненымі бэтонам старымі крэйсэрамі. У часе гэтай опэрацыі зышоўшые на бераг войскі павінны былі адцягнуць на сябе увагу ворагаў ад гэтай опэрацыі. Нашы высадзіўшыеся матросы дзержаліся цэлую гадзіну і вярнуліся назад на судны пасьля канца опэрацыі. Мы маем аснову думаць, што ўход у Зээбрінгэ зачынен і што ворагі мелі вялікіе матэрыальные шкоды.

Кароль телеграмай віншаваў з удачай прынімаўшые ўчасьце ў опэрацыі войскі і адзначыў незвычайную адвагу, выяўленную пры гэтым.

БЭРЛІН. **Урадова. 23.IV.** Англіцкае урадовае апавешчэньне аб опэрацыі проці узьбярэжжа Фляндрыі стараецца зрабіць уражэньне, бытцым Остэндэ і Зээбрінгэ зачынены. З гэтай прычыны трэба адзначыць, што англіцкая опэрацыя зусім не агранічыла свабоды нашых марскіх опэрацый на узьбярэжжы Фляндрыі.

БЭРЛІН. **Урадова.** 21 красавіка ротмістр барон ф. Ріхтгофэн не вярнуўся з аднаго палёту над Соммай. Гонючыся за варожым лятуном на незначнай вышыні ён, паводлуг Рэўтэра, быў на сьмерць ранен стрэламі з зямлі.

У апавешчэньні англіцкага фэльдмаршалка Гэга сказано: 21 красавіка збіты 11 варожых лятуноў. Між імі быў і нямецкі барон ф. Ріхтгофэн, каторы, паводлуг нямецкіх ведамасьцей, збіў больш за 80 ворагаў. Яго пахаранілі урачыста на малым магільніку неўдалёчку ад мейсца, дзе ён пагіб. На пахаронах яму была аказана ваенная чэсць.

Ротмістр ф. Ріхтгофэн скончыў 26 гадоў. Між іншым, ён у бітвах на паветры пабіў і знаменітых англіцкіх лятуноў: Больля і Робінзона. Сваю кар'еру лятуна ён пачаў пад кіраўніцтвам Бэлькэ, каторы быў яго вучыцелем. Вясной 1917 году за 5 тыдняў ён с падпаручыка быў павышэн да чыну паручыка, а пасьля—ротмістра. Ен меў 22 ордэры, ў тым ліку і найвышэйшы—«Pour le mérite».

БЭРЛІН (В.Т.Б.). 23.IV. У глаўнай камісіі Рэйхстагу ваенны міністэр, апісаўшы палажэньне на заходнім фронці, між іншым сказаў:

У Вялікай Баталіі некаторые часьці утрацілі дзьве. трэціны сваіх афіцэраў. Наагул страты нормальные. Баталія яшчэ йдзе поўным ходам, і мы з даверыем да глаўнай каманды павінны ждаць далейшых здарэньняў. Судзячы паводлуг чысла ўзятых намі ў палон амэрыканцаў, чысло амэрыканскіх войск яшчэ ня можэ быць значным“.

Социаліст Носкэ с прычыны перавозкі на заходні фронт італьянскіх войск, трэбаваў наступленьня аўстрыякаў на італьянскім фронці.

Дэпутат Готгэйм жадаў, каб Рэйхстагу была дадзена магчымасць пазнаёміцца з палажэньнем у занятых на ўсходзі землях.

БЭРЛІН. Рэзультат бітв на заходнім фронці за месяц — прадоўжэньне францускага фронту на 100 кіл., дзе англічан замянілі францускіе войскі. Дзеля прадоўжэньня гэтага фронту была, бязспорна, ужыта француская рэзэрвная армія, на каторую нашы ворагі ускладалі вялізарные надзеі.

ПАРЫЖ (Гавас). Немцы карыстаюць с перарыву ў баталіі, зьбіраючы матэрыалы, каб зламаць наш адпор. Апошні выстрэл дасць той, хто лепш здалее выкарыстаць свае памочные засобы. Наша задача—простая і ясная: працівіцца наступленьню да канца, не нарушаючы нашых рэзэрваў.

РОТТЭРДАМ. Англіцкі кароль выдаў загад аб наборы ўраз-жэ ўсіх мужчын да 23 гадоў.

Лёндонскі біскуп цыркулярным пісьмом клічэ ўсіх духоўных самахоць ісці ў салдаты. У кожнай парахвіі можэ астацца толькі адзін духоўны.

Англіцкіе спісы страт за апошніе два тыдні паказваюць 213.864 імёны.

Друкавана у друкарні М. Кухты. Выдавецтва «Гоман» Рэдактар Язэп Салавей.